Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 8 (556) Субота, 29 лютага 1964 г. Цана 1 кап. Год выдання XVII-ы

У філасофскім гуртку

## Ісціна нараджаецца ў спрэчках

У гэтым навучальным годзе мы пачалі вывучаць філасофію. Для нас, фізікаў, гэты цікавы і патрэбны прадмет зусім неабходны. Фізік павінен ведаць не проста асновы матэрыялістычнай філасофіі. Ён павінен умець творча прымяняць свае веды да растлумачэння новых фактаў, на якія такая шчодрая фізіка.

На вывучэнне курса дыялектычнага матэрыялізму ў нас маецца не так ужо шмат лекцыйнага часу. Але наш выкладчык кандыдат філасофскіх навук А. В. Самускевіч выкладае гэты прадмет цікава, нават вельмі цікава. Гэтым, як бачна, растлумачваецца тая ўвага, якую выклікала прапанова А. В. Самускевіча арганізаваць філасофскі гурток. У работу яго ўключыліся многія студэнты нашага курса, а таксама пяцікурснікі, якія яшчэ ў мінулым годзе займаліся ў гуртку, і некалькі студэнтаў матфака.

Заняткі гуртка праходзяць прыкладна так: спачатку хто-небудзь з гуртkоўцаў робіць даклад, потым пасля абмеркавання самога даклада пачынаецца дыскусія па пытаннях, якія былі ўзняты. Калі спрэчкі спыняцца, А. В. Самускевіч, які кіруе ўсім ходам работы, падводзіць вынікі абмеркавання, прыводзіць у парадак усё, што было сказана выступаўшымі, і, канешне ж, выказвае свой погляд на закранутыя праблемы.

На першым занятку студэнт 5 курса А. Саладухін зрабіў даклад «Аб філасофскіх праблемах адзінай тэорыі поля». У асноўным, абмяркоўваліся работы ў гэтым кірунку буйнейшых фізікаў сучаснасці А. Эйнштэйна і В. Гейзенберга.

«Кібернетыка і мозг» — такая тэма наступнага пасяджэння. Пасля даклада студэнта матфака Р. Несцерава разгарэлася, як ніколі, гарачая спрэчка. Спрачаліся аб тым, ці магчыма стварэнне думаючых кібернетычных прылад. Шмат розных думак было выказана аб шляхах дасягнення «з'яўлення свядомасці» ў электронных машын. Была, зразумела, і «аппазіцыя», якая сцвярджала, што з'яўленне мыслення немагчыма на падставе формы руху матэрыі, якая адрозніваецца ад біялагічнай. Спрэчка зацягнулася, і абмеркаванне гэтай праблемы прыйшлося адкласці на наступныя заняткі. Большасць урэшце рэшт прыйшла да вываду, што цяпер няма вялікай падставы для песімістычнага погляду на гэтую праблему.

Ці магчыма жыццё на іншых планетах, у іншых зорных сістэмах? Гэтае пытанне цікавіць вельмі многіх, калі не сказаць — усіх. Г. Пятрова, студэнтка матфака, выказала на пасяджэнні гуртка думку па гэтаму пытанню вядомых вучоных. У прыватнасці, яна прарэферыравала кнігу акадэміка І. С. Шклоўскага «Сусвет, жыццё, роздум».

Увогуле, гурток дае шмат для тых, хто актыўна ўдзельнічае ў яго рабоце: пашырае кола інтарэсаў, выпрацоўвае прывычку ўважліва выслухоўваць таварыша і адразу ж крытычна ацэньваць сказанае. Заняткі прывучаюць да самастойнага філасофскага мыслення, вучаць творча падыходзіць да рашэння філасофскіх праблем. Вельмі вялікая заслуга ў гэтым А. В. Самускевіча. Яму дапамагае, як мне здаецца, добрае веданне фізікі, яе найноўшых дасягненняў і праблем.

Гурток працягвае работу. Чарговыя даклады рыхтуюць Полазаў («Філасофскія праблемы фізікі элементарных часцін»), М. Малько («Праблема прычыннасці»). Думаецца, што яшчэ шмат карыснага прынясе нам работа ў філасофскім гуртку.

К. ДРАБОВІЧ,
стараста гуртка.

Абмяркоўваем артыкул „Хата прыгожая і вугламі“

## Быць заўсёды і ўсюды наперадзе!

У гэтым невялікім артыкуле мне хочацца прадоўжыць размову, якую пачаў на старонках нашай газеты Б. А. Мельцэр аб ролі цудоўных універсітэцкіх традыцый у выхаванні нашай моладзі.

Сапраўды, сябры, сёння мы вучымся, жывём кіпучым жыццём нашага ўніверсітэта, а пройдуць гады, пакінем мы яго сцены, будзем працаваць у школах, на заводах, у лабараторыях, будзем успамінаць наш БДУ і ўсё тое добрае, што звязана з ім, што назаўсёды застаецца ў сэрцы кожнага студэнта. Б. А. Мельцэр гаварыў у сваім выступленні пра многія ўжо забытыя традыцыі. Я хачу спыніцца на тых, якія ўжо ёсць у нас.

Надоўга застануцца ў памяці кожнага традыцыйныя вечары сустрэчы прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў-старшакурснікаў з першакурснікамі. Было б добра, калі б на такіх вечарах рэктар уручаў вялікай групе студэнтаў 1 курса розных факультэтаў студэнцкія білеты і заліковыя кніжкі.

А традыцыйныя сустрэчы выпускнікоў! О! Гэта вялікія святы і для тых, хто даўно скончыў БДУ, і для цяперашніх студэнтаў. Тут сустракаюцца прадстаўнікі розных пакаленняў, людзі, здавалася б, зусім розныя, але аб'яднаныя адным — любоўю да сваёй вну.

Фізікі летась на такім вечары паказалі героіка-эпічную камедыю «Архімед». Правільна гаварыў Б. А. Мельцэр: гісторыкі многае могуць на сваім вечары звязаць з імем Герадота, юрысты — Салона і г. д. Такія вечары будуць праходзіць цікава і жыва.

Багатае наша студэнцтва і на працоўныя традыцыі. Традыцыйнымі сталі паездкі нашых студэнтаў на цаліну. Улетку гэтага года студэнты ўніверсітэта будуць працаваць на будоўлях вялікай хіміі Беларусі. Традыцыяй стала ў нас і праца ў час канікул на будоўлях уласных, універсітэцкіх, а таксама на будоўлях Мінска. Дарэчы, вельмі карысна было б, каб кожны студэнт меў кніжку працы, якая адлюстроўвала б яго адносіны да працы.

Павінна стаць добрай традыцыяй і далейшая пасадка алеі Дружбы, закладзенай у нашым скверы ў красавіку мінулага года прадстаўнікамі сямі краін. А цяпер у нашым БДУ займаюцца студэнты з 14 краін Амерыкі, Афрыкі і Азіі. Пройдуць гады, дзесяцігоддзі, а цяністая алея будзе сведчыць аб вялікай дружбе моладзі розных краін 60-х гадоў.

Добрай традыцыяй будзе і тое, калі ўсе нашы студэнты пазнаёмяцца з біяграфіямі вядомых вучоных універсітэта, з жыццём і дзейнасцю першага рэктара БДУ, тых, хто быў першымі студэнтамі і першымі камсамольцамі ва ўніверсітэце, з гісторыяй сваёй вну.

Што казаць, ёсць яшчэ ў нас і такія прывычкі, якія могуць стаць дрэннай традыцыяй, калі не змагацца супраць іх. Гэта звычай некаторай часткі нашых студэнтаў «замачваць» любы свой поспех, любую няўдачу. Гэта і прыкрая прывычка некаторых «зраб.ць па рубліку» 15 чысла кожнага месяца, у дзень атрымання стыпендыі. Такім «традыцыям» у нашым жыцці мы павінны аб'явіць жорсткую вайну.

І яшчэ: вельмі хацелася б, каб самай добрай традыцыяй студэнтаў нашага Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна назаўсёды стаў дэвіз: «Быць заўсёды і ўсюды наперадзе!».

Г. РЫЛЮК.

## Прафесар прыйшоў у інтэрнат

Восенню мінулага года прафесар Іван Мікалаевіч Лушчыцкі, загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі, у складзе савецкай дэлегацыі наведаў Італію.

Грамадскія арганізацыі гістарычнага факультэта звярнуліся да яго з просьбай расказаць аб уражаннях ад паездкі. Іван Мікалаевіч згадзіўся. І вось у адзін з вечароў пакой адпачынку ў інтэрнаце па Паркавай, 9, дзе жывуць гісторыкі, запоўнены да адказу.

Студэнты ўважліва і з цікавасцю слухаюць павольны расказ Івана Мікалаевіча. Ён жа пабываў у шмат якіх гарадах Італіі, сустракаўся з вучонымі Рымскага ўніверсітэта. Свой расказ прафесар суправаджае дэманстрацыяй дыяфільма. На многія пытанні студэнтаў адказаў ён у той вечар.

А гэтымі днямі студэнты запрасілі ў інтэрнат прафесараў Гілера Маркавіча Ліўшыца і Мікалая Паўлавіча Палетыку. Гілер Маркавіч правёў гутарку аб тым, як лепш працаваць над кнігай, даў добрыя парады аб вывучэнні замежных моваў.

Больш як дзве гадзіны працягвалася гутарка М. П. Палетыкі. Мікалай Паўлавіч расказаў аб гадах вучобы ў Кіеўскай гімназіі, дзе ён вучыўся разам з пісьменнікам Канстанцінам Паустоўскім, аб сумеснай рабоце з акадэмікам Майскім, сустрэчах з акадэмікамі Тарле і Пакроўскім.

Партбюро і камітэт камсамола факультэта сістэматычна арганізоўваюць сустрэчы выкладчыкаў і студэнтаў у інтэрнаце. Ды і часта выкладчыкі самі, па ўласнай ініцыятыве прыходзяць пагля дзець, як жывуць іх выхаванцы. У гэтым навучальным годзе ў інтэрнат прыходзілі Фёдар Макаравіч Нячай, Марыя Парфір'еўна Баранава, Таццяна Іванаўна Прыцыцкая, Рахіль Абрамаўна Нікольская, Беніамін Айзікавіч Мельцэр і іншыя выкладчыкі.

К. СУЧКОЎ,
сакратар камсамольскай арганізацыі гістфака.



* * *

*«Выконваецца песня «Цаліна»,—аб'явіў канферансье. І, як заўсёды, у зале ўспыхваюць апладысменты, бо і песня добрая, свая, студэнцкая, і выконвае яе звычайна сам аўтар, студэнт 3 курса юрфака Леанід Дамашэўскі. Вось і гэты здымак зроблены ў час канцэрта, калі Леанід Дамашэўскі, Іван Скаскевіч (3 курс матфака), і Мірон Бобер (5 курс гістфака) спяваюць «Цаліну».*

Фота В. ЛУЦЭНКІ.

## Матэматычная алімпіяда

У мінулым годзе матэматычны факультэт БДУ і рэдакцыя газеты «Знамя юности» правялі першую матэматычную алімпіяду. Яна прайшла з вялікім поспехам. У час алімпіяды матэматычны факультэт пазнаёміўся з многімі выпускнікамі сярэдніх школ, якія любяць і ведаюць матэматыку. У гарадах і сельскай мясцовасці выяўлены школы з узорна пастаўленым выкладаннем матэматыкі. Такія школы з'яўляюцца сапраўднымі цэнтрамі матэматычнай культуры рэспублікі.

Сёлета праводзіцца другая матэматычная алімпіяда рэспублікі. 23 лютага газета «Знамя юности» апублікавала яе ўмовы. У алімпіядзе могуць удзельнічаць усе жадаючыя. Удзельнікам лічыцца рашыўшы хоць бы некаторыя з прапанаваных задач. Як і летась, алімпіяда будзе праходзіць у два туры. Першы закончыцца да 31 сакавіка, другі — да 10 мая. Першы тур завочны. 250 чалавек, якія набяруць найбольшую колькасць ачкоў на завочнай пісьмовай рабоце, умовы якой таксама апублікаваны ў газеце ад 23 лютага, будуць лічыцца пераможцамі першага тура. Імёны пераможцаў будуць апублікаваны.

Пераможцы першага тура будуць выкліканы на другі тур — субяседванне з членамі журы алімпіяды ў БДУ, у абласныя і некаторыя раённыя цэнтры рэспублікі. Вынікі субяседвання будуць ацэньвацца па пяцібальнай сістэме. Пераможцамі алімпіяды будуць лічыцца ўдзельнікі, атрымаўшыя «выдатна» пры субяседванні.

Журы алімпіяды складаецца з членаў прадметнай камісіі па матэматыцы на прыёмных экзаменах 1964 года ў БДУ. Вынікі алімпіяды будуць істотна ўлічвацца пры паступленні яе пераможцаў на матэматычны і фізічны факультэты нашага ўніверсітэта.

(Наш кар.)

## УНІВЕРСІТЭЦКАЯ ХРОНІКА

Да 95-годдзя з дня нараджэння НАДЗЕЖДЫ КАНСТАНЦІНАЎНЫ КРУПСКАЙ бібліятэка нашага ўніверсітэта арганізавала кніжна-ілюстрацыйную выстаўку.

* * *

«ЖУРНАЛІСТ» № 1 (24) — вучэбная газета аддзялення журналістыкі — выйшаў з друку 27 лютага. Нумар газеты, які рыхтавала да друку група студэнтаў 2 курса аддзялення журналістыкі пад кіраўніцтвам выкладчыка Анатоля Вікенцьевіча Балаша, прысвечаны працоўным будням горада хіміі — Салігорска. Рэдактар нумара — Я. Гарэлік, адказны сакратар — З. Прыгодзіч.

* * *

«СУПРАЦОЎНІКІ УНІВЕРСІТЭТА — ВЕТЭРАНЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ»—такую фотавыстаўку арганізаваў партыйны камітэт БДУ напярэдадні святкавання 46-й гадавіны Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Выстаўка расказвае аб гераічным шляху, які прайшлі ў гады вайны многія нашы выкладчыкі і прафесары.

* * *

«400 ГАДОЎ РУСКАЙ ДРУКАВАНАЙ КНІЗЕ» —гэтая выстаўка, арганізаваная бібліятэкай універсітэта, ужо некалькі дзён прыцягвае ўвагу калектыву БДУ. На выстаўцы прадстаўлены арыгінальныя старажытныя кнігі, а таксама кнігі, якія расказваюць аб развіцці друкарскай справы ў краіне і ў рэспубліцы.

* * *

«КВН-64» трансліраваўся па тэлебачанню ў мінулую сераду з актавай залы БДУ. У спаборніцтве вясёлых і знаходлівых гаспадары сцэны, студэнты ўніверсітэта, з мінімальным лікам перамаглі гасцей з медыцынскага інстытута.

# Алімпійскі год — не толькі для алімпійцаў

У тырольскай сталіцы 12 дзён адбывалася адна з самых знамянальных спартыўных падзей нашага часу — IX зімовыя Алімпійскія гульні. Выдатных поспехаў дасягнулі савецкія спартсмены на Белай алімпіядзе, і яны не могуць не радаваць савецкіх людзей.

Віншаванні М. С. Хрушчова, накіраваныя нашым спартсменам-алімпійцам, горача ўсхвалявалі іх сэрцы, сэрцы ўсіх аматараў спорту. Клопаты М. С. Хрушчова аб нашых спартсменах дапамаглі ім у спартыўнай барацьбе. Дасягненні каманды СССР у Інсбруку сведчаць аб вельмі высокім узроўні развіцця масавага спорту ў нашай краіне.

Рэха Белай алімпіяды панеслася далёка, далёка. Наперадзе новыя спаборніцтвы, наперадзе — Токіо, дзе будуць праходзіць XVIII летнія Алімпійскія гульні.

Выдатных поспехаў дасягнулі і ўніверсітэцкія спартсмены: аспірант хімічнага факультэта Уладзімір Гараеў і выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту Віталій Фефелаў. Яны сталі кандыдатамі ў алімпійскую зборную СССР. Пажадаем жа ім поспехаў на XVIII Алімпіядзе!

Але алімпійскі год — не толькі для алімпійцаў. Спартсмены ўніверсітэта сёлета праводзяць шэраг масавых спаборніцтваў, дзе яны змогуць прадэманстраваць сваё майстэрства. Найбольш масавыя спаборніцтвы — па лыжнаму спорту, лёгкай атлетыцы, спартыўнай гімнастыцы, кросу, стральбе, баскетболу. Акрамя таго, нашы спартсмены будуць удзельнічаць у 8-й рэспубліканскай студэнцкай спартакіядзе па 19 відах спорту і ў IV Усесаюзных студэнцкіх гульнях.

Рыхтуючыся да гэтых спаборніцтваў, многія спартсмены і зборныя каманды ўніверсітэта значна павысілі сваё майстэрства. Добра выступае сёлета наша жаночая баскетбольная каманда (трэнер Г. М. Грудо). У адборачным турніры мацнейшых каманд горада яна заваявала права выступаць у першынстве рэспублікі.

Зімовае першынство Белсавета ДСТ «Буравеснік» па лёгкай атлетыцы, якое праходзіла ў Брэсце, паказала, што нашы вядучыя лёгкаатлеты нядрэнна правялі падрыхтоўчы сезон (трэнеры В. Г. Кушнароў, М. А. Жаўнерка, Н. Д. Фінкінштэйн).

Паспяхова выступіла наша каманда плыўцоў на першынстве ЦС СДСТ «Буравеснік» у час зімовых канікул. Нашы спартсмены здолелі апярэдзіць моцныя калектывы ўніверсітэтаў Ленінграда і Кіева, політэхнічных інстытутаў Кіева і Львова.

Таварыскія сустрэчы нашых фехтавальшчыкаў у час зімовых канікул са студэнтамі Ленінградскага ўніверсітэта, БПІ і ІФК паказалі пэўны рост майстэрства ўніверсітэцкіх спартсменаў. Аднак трэба сказаць, што ў камандзе яшчэ шмат слабых месц. Недастатковую падрыхтоўку маюць эспадраністы і жанчыны-рапірысткі.

З вялікім жаданнем і стараннасцю працуюць члены зборных па вольнай барацьбе Іван Гурын, Яўгеній Каратаеў, Эдуард Пагодскі, Уладзімір Ахрамейка, па цяжкай атлетыцы — Уладзімір Стронгін, Валерый Канайлаў, Уладлен Бялоў, Яўгеній Туромша, Міхаіл Марцінчык, па спартыўнай гімнастыцы — Раіса Чэхава, Інеса Неманава, Ала Кузняцова, Галіна Фральцова, па мастацкай гімнастыцы — Марыта Валахановіч, Людміла Еўдакімава, Валянціна Яроменка, Валянціна Фрыдман і многія іншыя. Яны ведаюць, што для іх пачынаецца свая алімпіяда — 8-я спартакіяда студэнтаў рэспублікі, у якой моцны калектыў універсітэта мае ўсе магчымасці для паспяховага выступлення.

Фізкультурнікі і спартсмены ўніверсітэта! Смялей дзярзайце ў рабоце і вучобе, у дасягненні новых рубяжоў у спорце!

**В. П. ШАПЯЛЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізвыхавання і спорту**



*Улічваючы вялікае развіццё і папулярнасць шашачнага спорту ў нашым універсітэце, Мінская студыя тэлебачання арганізавала гэтымі днямі перадачу аб рабоце шашачнага клуба БДУ. Адным з вядучых удзельнікаў гэтай перадачы быў інжынер вылічальнага цэнтра ўніверсітэта, намеснік старшыні федэрацыі шашак БССР кандыдат у майстры Генадзь Драбушэвіч. Яго вы і бачыце на здымку, які быў зроблены ў час сеанса адначасовай гульні.*

# Прызавое месца лыжнікаў

**Першынство ВНУ рэспублікі па лыжах сёлета праходзіла ў раёне станцыі Ганалес. Усе ўдзельнікі прыехалі сюды з адзінай мэтай: як мага лепш выступіць, бо спаборніцтвы па лыжнаму спорту ўваходзяць у праграму круглагадовай спартакіяды ВНУ БССР. Не хацелася падводзіць сваіх калег — спартсменаў іншых відаў спорту.**

**У першы дзень спаборнічалі жанчыны на дыстанцыі 5 кіламетраў і мужчыны на 15 кіламетраў. Першае месца з вынікам 22.23 заняла студэнтка хімфака О. Філіповіч; а Л. Дубініна і Д. Усаевіч, таксама нашы спартсменкі, — адпаведна 6 і 9 месцы. Сярод лыжнікаў мацнейшым аказаўся наш А. Галкоўскі. Яго час — 1:01.29. Пасля першага дня спаборніцтваў дзяўчаты ў камандным заліку занялі 2, а хлопцы — 6 месца.**

**Другі дзень быў днём эстафет. Нашы дзяўчаты (Усаевіч, Дубініна і Філіповіч) перамаглі ў эстафеце 3x5 кіламетраў, а хлопцы занялі толькі восьмае месца.**

**Апошні дзень не прынёс вялікіх змен у размеркаванні камандных месц. Першае месца па-ранейшаму займалі спартсмены ІФК, другое БПІ, трэцяе — БДУ. Так на трэцім месцы, і засталіся нашы спартсмены ў выніку трохдзённай барацьбы. Каманда маладая, перспектыўная. І можна з упэўненасцю сказаць, што ў будучым яна будзе выступаць лепш і будзе змагацца за больш высокае месца.**

**П. ЯВІД,**

**член зборнай каманды БДУ па лыжах, студэнт 5 курса геафака.**

## Лепшыя спартсмены БДУ

# Тройчы майстар спорту



**Яўген Емяльянаў на дыстанцыі.**

*Калі ў дэканаце хімфака я завёў размову аб лепшых спартсменах, мне параілі перш за ўсё сустрэцца з Яўгенам Емяльянавым, студэнтам пятага курса.*

*— Гэта наш лепшы плывец, — сказала адна з яго аднакурсніц.*

*— Ён у нас і кіраўнік спартбюро факультэта, — дадала другая.*

*Яўгена я знайшоў ля спартыўнага стэнда. Ён старанна наклейваў фотакарткі, штосьці надпісваў, а, заўважыўшы мяне, пацікавіўся:*

*— Вам каго?*

*Зразумеўшы, што я шукаў яго, Яўген сціпла пацісну́ў плячыма, пачаў расказваць. І хоць размова была не вельмі доўгая, адчувалася, што юнак па-сапраўднаму любіць спорт.*

*А захапіўся ён спортам яшчэ ў чацвёртым класе. Дзевяцікласнік Яўген Емяльянаў ужо быў вядомы як чэмпіён па плаванню цэнтральнага савета «Дынама» сярод юнакоў. Не аднойчы ён абараняў гонар рэспублікі і ў іншых спаборніцтвах, пабываў таксама ў Варшаве.*

*Асабліва запомніліся яму дні мінулай восені, калі на спаборніцтвах па плаванню III Спартакіяды народаў СССР ён заняў пятае месца. Яўген ужо тройчы выканаў майстарскі нарматыў па плаванню, пераадолеўшы 100 метраў спосабам «дэльфін» за 1.04,4, 200 метраў — за 2.26,2, 400 метраў «комплексным» — за 5.11,7.*

*Але на дасягнутым юнак не спыняецца. Нават у гэтыя дні, калі ідуць экзамены, Яўгена часта можна бачыць на трэніроўках у адкрытым басейне ля парку Чалюскінцаў або ў спартыўнай зале. Адразу пасля экзаменаў Яўген вылятае ў Баку, дзе ён павінен прыняць удзел ва Усесаюзным першынстве студэнтаў па плаванню.*

*Ёсць у Яўгена Емяльянава адна мара, якую рэдка каму давярае. Гэта мара любога спартсмена: пабываць на алімпійскіх гульнях у Токіо.*

*Добрых табе поспехаў, Жэня!*

*М. ДРОЗД.*

# Яшчэ адзін рэкорд!

*Некалькі дзён мацнейшыя плыўцы рэспублікі спаборнічалі па праграме плавацельнага шматбор'я. Паспяхова выступілі ўніверсітэцкія спартсмены. Уладзімір Бандарэнка (2 курс фізфака) устанавіў новы рэкорд рэспублікі ў плаванні на спіне на 100 метраў — 1 мінута 05,4 секунды. Ён жа перамог у плаванні на 200 метраў на спіне — 2 мінуты 24,0 секунды. Гэты вынік вышэй нарматыву майстра спорту. Выпускнік хімічнага факультэта Яўген Емяльянаў аказаўся мацнейшым у плаванні на 200 метраў спосабам «дэльфін» — 2 мінуты 35,3 секунды.*

*У апошні дзень спаборніцтваў рэкардсмен рэспублікі Я. Емяльянаў перамог у комплексным плаванні — 2 мінуты 28,4. У. Бандарэнка заняў другое месца.*

*У плавацельным шматбор'і У. Бандарэнка заняў другое месца, а яго аднакурснік Аляксандр Папко — трэцяе.*

(Наш кар.).

# НЕ ТОЛЬКІ СЭНС...

**(Заўвагі пра некаторыя вершы, дасланыя ў рэдакцыю).**

Вершы пішуць людзі розных прафесій, розных узростаў. Праўда, часта гэта яшчэ не паэзія, а простае вершаскладанне. Але ўжо сам факт цягацення людзей «гаварыць у рыфму» знамянальны.

Наша рэдакцыя часта атрымлівае вершы ад сваіх чытачоў. Некаторыя з іх маюць і прыпіскі ад аўтараў, накшталт гэтай: «Дарагая рэдакцыя! Прашу вас надрукаваць мае вершы ў вашай газеце. Не здзіўляйцеся, людзі ўсіх прафесій валодаюць якімсьці дарам паэзіі. Аднак усякая паэзія пачынаецца з першых вершаў... Я ж пасылаю толькі першыя, верачы, **што ў іх ёсць сэнс** (падкрэслена мной. — **В. К.**). З павагай — М. Крайнікаў, 2 курс юрфака)».

Я спецыяльна падкрэсліў словы Мікалая Крайнікава, бо, як мне здаецца, менавіта ў іх хаваецца галоўная бяда многіх пачынаючых паэтаў. Вось пра гэтую бяду і хацелася б пагаварыць больш падрабязна.

Вершатворчасць — гэта **мысленне ў мастацкіх вобразах.** Апрача таго, паэзія — заўсёднае першаадкрыццё. Калі ты не можаш сказаць аб жыцці штосьці новае, ці па-новаму, — лепш не аддавай свае радкі на суд чытачу. Тут дарэчы ўспомніць словы Максіма Багдановіча, звернутыя да малодшых калег па пяру:

**«Ведай, брат малады, што ў грудзях у людзей**
**Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення.**
**Разаб'ецца аб іх слабы верш заўсягды,**
**Не збудзіўшы святога сумлення.**
**Трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш,**
**Абрабіць яго трэба з цярпеннем.**
**Як ударыш ты ім, ён, як звон, зазвініць,**
**Брызнуць іскры з халодных каменняў!»**

Магчыма, такія патрабаванні да пачынаючых паэтаў рана прад'яўляць? Не, не рана! У супрацьлеглым выпадку паэзія дзялілася б на розныя катэгорыі па ступені яе вартасці. А гэта ўжо зусім бязглуздзіца!

І вось, калі прыкласці нашы разважанні да вершаў, што сёння разглядаюцца, можна ўбачыць наступнае.

І М. Крайнікаў, і С. Зубовіч (1 курс вяч. аддз. геафака), і М. Кацюшын (4 курс завочнага аддз. журналістыкі) грэбуюць асноўным у паэзіі — вобразнасцю. Можна прачытаць дзесяткі радкоў і не сустрэць ні свежай метафары, ні сакавітага эпітэта, ні новага параўнання. Што варты, напрыклад, наступныя «фарбы» з мастацкай палітры, якія зніжаюць маляўнічасць верша да натуралізму! Марознае паветра «жжет как спирт»; дым «как штопором, винтит (?) гладь неба»; усходу «розовый сироп»; снег «хрустит под ногой засохшей хлебной коркой» (С. Зубовіч, «Рассвет»). І гэта ў адным вершы, які складаецца толькі з трох строф!

У некаторых вершах М. Крайнікава нават не вытрыманы памер.

У вялікай нізцы вершаў М. Кацюшына, праўда, адчуваецца нейкі вопыт вершаскладання.

Аднак і тут, на вялікі жаль, няма свежага дыхання паэзіі. І таму чытача не можа ўсхваляваць аўтарская любоў да родных мясцін.

Можа ўзнікнуць пытанне: няўжо ў маладых аўтараў няма нічога дадатнага? Ёсць. Гэта роздум пра жыццё, пра абавязкі савецкага чалавека (М. Крайнікаў), пра сучасную рамантыку наогул і рамантыку нялёгкай працы геадэзіста, для якога нават карта — «это поэма» (С. Зубовіч), пра любоў да радзімы, пра імкненне як мага больш зрабіць для людзей (М. Кацюшын). Карацей кажучы — тое, што ў самым пачатку было ахрышчана словам «сэнс».

Аднак вершы нават з такімі думкамі і пачуццямі не прымусяць чытача хвалявацца. Трэба, каб гэтыя думкі і пачуцці знайшлі арыгінальнае мастацкае ўвасабленне. А для гэтага, апрача здольнасцей, патрэбна праца, доўгая і старанная, нялёгкая і высакародная.

**В. КАЧАНОВІЧ.**



*У НЯДЗЕЛЬНЫ ДЗЕНЬ.*

*Фота В. ЛУЦЭНКІ.*


**Рэдактар М. ІОСЬКА.**

**Адрас рэдакцыі:**
Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсаўпрофа.
АТ 03498 Тыр. 2000 Зак. 987.